Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

*Алена Цітавец*

# ПСАЛТЫР 1576 Г.: ЛЁС КНІГІ

*У публікацыі раскрываецца гісторыя бытавання асобніка «Псалтыра з чырвонымі кропкамі» з фонду Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі. Кніга была выдадзена Пятром Мсціслаўцам у Вільні ў Доме Мамонічаў у 1576 г. Асобнік дайшоў да нашага часу страціўшы частку аркушаў у пачатку і канцы кнігі. Падчас рэстаўрацыі, праведзенай стараабрадцамі ў першай палове XIX ст., у кнігу былі ўплецены 74 рукапісныя аркушы. Апрача страчанага арыгінальнага тэксту, на іх былі «новыя» тэксты, запазычаныя з больш позніх маскоўскіх дарэформенных выданняў. Верагодна, дапаўненні з'явіліся, каб зрабіць Псалтыр XVI ст. зручным для паўсядзённага карыстання ў XIX ст. Пасля 1845 г. асобнік быў канфіскаваны ў стараабрадцаў, і яго ўладальнікамі сталі па чарзе некалькі буйных бібліятэк Масквы.*

У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі) захоўваецца чатыры асобнікі трох выданняў Пятра Мсціслаўца. Прадметам дадзенага даследавання з'яўляецца Псалтыр, так званы «Псалтыр з чырвонымі кропкамі»[1], выдадзены ў Вільні ў Доме Мамонічаў у 1576 г.

Псалтыр – адна з найбольш важных богаслужбовых кніг. Апрача таго кніга выконвала шмат функцый у паўсядзённым жыцці чалавека: па ёй навучалі грамаце, кнігай бласлаўлялі маладых, яе чыталі над памерлым, па ёй нават варажылі. Кніга з дадаткам Часаслова і розных «следаванняў» называлася «Псалтыр следаваны», без іх (як у дадзеным выпадку) – «Псалтыр просты» [9, с. 324–325].

Выданне 1576 г. лічыцца дастаткова рэдкім, да нашага часу дайшла невялікая колькасць яго асобнікаў. Вядомыя 50 экзэмпляраў і 1 фрагмент, у іх ліку ў Беларусі захоўваецца два: у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (09/4043 К) і ў ЦНБ НАН Беларусі (К16-18/Ср22) [4, с. 456]. Апошні экзэмпляр паступіў у фонд аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў у 1965 г. з Музея кнігі Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна (цяпер – Расійская дзяржаўная бібліятэка).

Упершыню пра асобнік К16-18/Ср22 паведамлялася ў 1976 г. у публікацыі супрацоўніка аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Валянціны Білевіч, якая паклала пачатак вывучэнню кніг кірылічнага друку ў

[1] Псалмы раздзелены кропкамі чырвонага колеру.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

акадэмічнай бібліятэцы [1, с. 101]. З 2014 г. у бібліятэцы праводзіцца работа па паглыбленым даследаванні кірылічных старадрукаў адпаведна запытам сучаснай навукі.

Кожны старадрукаваны асобнік захоўвае шмат каштоўнейшай інфармацыі. З усіх яго «сакрэтаў» кнігазнаўцаў цікавяць у першую чаргу гісторыя друкавання (агульная для ўсіх экзэмпляраў), і прыватная гісторыя асобніка.

Гісторыя першая. Асобнік К16-18/Ср22 не захаваўся ў ідэальным выглядзе, ён страціў частку арыгінальных аркушаў у пачатку і канцы кнігі: гравюру з выявай цара Давіда, а таксама аркушы 1–16, 246–250 і ўсе пустыя, якія былі ў выданні першапачаткова. Адсутнічаюць фрагменты аркушаў 17–203, 231, 237, 244, 245.

У першай палове XIX ст. была праведзена рэстаўрацыя кнігі, падчас якой аркушы 17–245 былі паабразаныя па баках і ўклееныя ў папяровыя рамкі[2]. Арыгінальная фаліяцыя такім чынам была зрэзаная, што абцяжарыла ў далейшым ідэнтыфікацыю аркушаў. Арыгінальны друкаваны тэкст цяпер пачынаецца з 17-га аркуша і заканчваецца 245.

Тым не менш асобнік яскрава адлюстроўвае асаблівасці выдання Пятра Мсціслаўца ў Доме Мамонічаў. Пераважная большасць паперы змяшчае вадзяны знак «Дзік» (1571) [11, № 265–1, № 266], сустракаюцца філіграні з выявамі «Крыжа» (1569) [13, № 1789], гербаў «Астоя» з літарамі «М» і «К» (1575) [13, № 2554], «Ястрабец» (1567) [12, № 466–А–1], «Эліта» (1570) [12, № 181–А].

Экзэмпляр адносіцца да першага друкарскага варыянту [5, с. 152]. Арнамент Пятра Мсціслаўца прадстаўлены дзвюма застаўкамі з дзвюх дошак і дзевятнаццаццю ініцыяламі чырвонага і чорнага друку з дванаццаці дошак. У асобніку можна ўбачыць таксама ўзоры ламбардаў і вязі.

Не менш цікавая другая, прыватная, гісторыя бытавання асобніка, якая ахоплівае амаль 440 гадоў – чым старэй кніга, тым багацей яе «асабістае жыццё». Асобнік Псалтыра 1576 г. адметны сваімі шматлікімі ўстаўкамі і папаўненнямі.

Страчаныя аркушы былі «кампенсаваны» рукапіснымі (арк. 1–14; арк. 1–3 (пасля 203); арк. 1–49 (пасля 245)[3], арк. 51–57 (пасля

---

[2] На асобных аркушах, выкарыстаных для вырабу рамак, бачны вадзяныя знакі з датай «18...» і «...4».

[3] Аркуш 50 пусты.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

245). Рукапісныя аркушы (усяго 74) складаюць амаль чвэрць кодэксу. Пры рэстаўрацыі арк. 1–3 (пасля 203), 1–42 (пасля 245) былі акуратна ўклеены ў папяровыя рамкі. Адсутныя фрагменты арыгінальнага друкаванага тэксту адноўлены рукапісным.

Рукапісны тэкст напісаны паўуставам двума почыркамі: 1) арк. 1–14; арк. 43–49, 51–57 (пасля 245); фрагменты на арк. 17–202, 231 адв., 237, 244, 245, 245; 2) арк. 1–3 (пасля 203); арк. 1–42 (пасля 245).

Рукапісныя дапаўненні былі зробленыя ў першай палове XIX ст. Пра гэта сведчыць папера рускай вытворчасці з адпаведнымі вадзянымі знакамі: літары «УФЛП» (1812, 1815) [7, № 900, 901]; спрошчаны герб Сімбірскай губерні (1809–1822) [7, № 388]; «Лілея» (1804, 1810) [7, № 890]; «Лілея» (1845) [7, № 866]; «Pro Patria» (1815) [7, № 430]; герб Яраслаўскай губерні (1828–1836) [7, с. 236, 237, № 13]; «181[2]»; «1814»; «1822».

На рукапісных аркушах, апрача папаўнення страчанага тэксту, змешчаныя дадатковыя ўстаўкі. У пачатку кнігі – малітвы да чытання Псалтыра: «*Разумно да будетъ. како начати иноку wсобь пѣти Ѱалтырь*». У вядомых захаваных экзэмплярах Псалтыра гэты тэкст адсутнічае. Але, па звестках расійскага бібліёграфа XIX ст. Івана Каратаева, такая прадмова ў выданні была [6, с. 191–193]. Магчыма, таму пры рэстаўрацыі асобніка гэты страчаны тэкст быў адноўлены і ўключаны. Вядомыя прыклады такіх прыпляценняў і ў іншыя экзэмпляры Псалтыра 1576 г. [8, с. 105–106, № 86.6. РГБ № 8505; № 86.7. РГБ № 8529; № 86.8. РГБ № 8628].

Падчас рэстаўрацыі паміж 203 і 204 друкаванымі аркушамі былі ўплеценыя тры аркушы з дадатковымі рукапіснымі тэкстамі малітваслова («*Слава, ї н(ы)нѣ. По совершенїи же неколикихъ кафисмъ или всего Ѱалтырѧ...*») з указаннямі па іх выкананні ў залежнасці ад асобы чытальніка: «*Аще попъ, кончаетъ священнически. Ащели простыи, кончаетъ сице: "Г(оспод)и І(исус)е Х(рист)е, С(ы)не Б(о)жїи...*» Паміж аркушамі 203, на адвароце якога заканчваюцца выбраныя псалмы, і аркушам 204, на якім пачынаецца «*Мнwгом(и)л(о)стивое*», дадатковыя рукапісныя тэксты ўстаўляліся неаднаразова. Такі прыклад адзначаны ў асобніку Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі [8, с. 106, № 86.8. РГБ № 8628]. Дарэчы, першапачаткова ў выданні паміж 203 і 204 друкаванымі аркушамі былі 2 пустыя аркушы. Магчыма, іх некалі



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

выкарыстоўвалі для дадатковых тэкстаў. Так з'явіўся асобнік, які стаў узорам для папаўнення наступных.

Вядомыя прыклады прыпляцення рукапісных аркушаў з дадатковымі тэкстамі ў канцы асобнікаў Псалтыра 1576 г. з кнігазбору Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, дзе былі дададзены 18, 21, 57 аркушаў [8, с. 105–106, № 86.5. РГБ № 7495; № 86.7. РГБ № 8529; № 86.8. РГБ № 8628].

У асобніку акадэмічнай бібліятэкі пасля апошняга друкаванага аркуша таксама прыплецена 57 аркушаў. На аркушах 1–32 (пасля 245): *«Оуставъ с(вя)тыхъ ѿ(е)цъ б(о)гомъ преданныи. всѣмъ хωтящимъ пѣти Ѱалтырь...»*. На аркушах 32 адв.–42: «*Вѣдомо же боуди, сице да поеши канонъ сей оусопшимъ*». На аркушах 43–48: «*Вѣдомо же боуди, сице да поеши канонъ сей за д(у)шу оумершаго...*». Гэтыя тэксты звязаныя з рэлігійным абрадам чытання Псалтыра над целам нябожчыка да яго пахавання і ў памяць пасля яго пахавання.

Чыталі Псалтыр «на ўсякую патрэбу», у розных жыццёвых абставінах. На аркушы 42 (пасля 245) змешчаны маленькі тэкст: «*Оуставъ о искушенїи скитских инокъ. Внегда случитсѧ кому ωскверниттисѧ во снѣ по дѣиству дїаволю, воставъ въборзе ѿ ложа, и творит стих сице г(лаго)летъ:..*». Гэта ўрывак са «Скітскага пакаяння», якое з'явілася ў рускай праваслаўнай духоўнай традыцыі ў канцы XV ст. і было створана як устаў споведзі для манахаў-пустэльнікаў. У XIX ст. тэкст актыўна выкарыстоўваўся ў стараабрадніцкім асяроддзі: у беспапоўцаў у якасці ўстава самасповедзі, у іншых стараабрадніцкіх сагласах – у якасці ачышчальнай малітвы перад прычасцем [10].

На аркушах 51–57 змешчаны «*Канонъ молебенъ, како подобаетъ пѣти за творѧщихъ м(и)л(о)стыню*». Гэты канон упершыню з'явіўся ў маскоўскім выданні «Псалтыра следаванага» 1625 г., а стараабрадцы дадавалі тэкст да «Псалтыра простага» [2, с. 168].

Верагодна, дапаўненні з'явіліся, каб зрабіць Псалтыр XVI ст. зручным для паўсядзённага карыстання ў XIX ст. Гэтых тэкстаў не было ў арыгінальным выданні 1576 г., яны з'явіліся пазней, былі запазычаныя з маскоўскіх дарэформенных выданняў і папулярных стараабрадніцкіх твораў [3, с. 179].

Былыя ўладальнікі паклапаціліся і пра мастацкае афармленне кнігі. Упрыгожваюць рукапісныя лісты 6 заставак старадрукаванага



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

стылю (4 штампаваныя, 2 маляваныя), маляваныя ініцыялы «Б», «І», «У», а таксама маргінальнае ўпрыгожванне, вязь.

Адметная мініяцюра «цар Давід» (235x163 мм), выкананая чорнай тушшу і размаляваная акварэльнымі фарбамі (чырвонай, жоўтай, шэра-блакітнай). Малюнак на мініяцюры нагадвае вобраз традыцыйнага аўтара псалмоў на ксілаграфіі Пятра Мсціслаўца, але ў спрошчанай форме. Цар Давід тут больш падобны на цара з народных казак (у лубачнай манеры), ён складае псалмы не ў асяроддзі раскошных вазонаў і калон, а сярод рэальных бытавых прадметаў .

Кніга апранута ў пераплёт першай паловы XIX ст., зроблены з дошак, абцягнутых карычневай скурай. На вечках цісненне ў выглядзе арнаментальных рамак, на верхнім вечку сярэднік з ромбам унутры і цісненнем «Книга глаголемая». На спінцы цісненне з раслінным арнаментам. Форзацы з паперы с вадзяным знакам «Лілея» (1845) [7, № 866]. Адна зашпілька з жоўтага металу ў выглядзе літой спражкі з кручком. Ад другой захаваўся толькі фрагмент рэменя, прыбітага цвікамі да ніжняга вечка. Абрэз афарбаваны ў цёмна-сіні колер.

Захаваўся памінальны запіс былых уладальнікаў: 1) «Лета 7353 [1845] переставилась раба Божея Феодосия Наталья Кондратьевна месеца марта во 2-рыи день 1845 года. Жила всехъ летъ 42 года».

Такім чынам, у першай палове XIX ст. дадзеная кніга, як большасць кірылічных выданняў XVI ст., знаходзілася ў асяроддзі стараабрадцаў, верагодна, папоўцаў (у дадатковых рукапісных тэкстах ёсць указанні для папа). Кнігай актыўна карысталіся для выканання паўсядзённых рэлігійных абрадаў. Яна была старанна рэстаўраваная з беражлівым узнаўленнем кожнай старонкі страчанага тэксту, набыла «новыя» патрэбныя ўладальнікам рукапісныя тэксты. Была апранута ў новы пераплет, зроблены ў XIX ст. па ўзору маскоўскіх дарэформенных. Імёнаў былых уладальнікаў-стараабрадцаў, на жаль, не захавалася. Засталося толькі імя сваячкі, якая памерла ў 1845 г., – «Наталья Кондратьевна».

На гэтым «мірское» жыццё асобніка заканчваецца. Прасачыць яго далейшы лёс можна па адзнаках наступных уладальнікаў. Захаваўся штамп «Библиотека Московской духовной академии» (авальны з рамкай (19 x 35 мм), арк. 1); ярлык: «Старопечат. Моск. Син. Б-ки N22» (сіняя папера (27 x 35 мм), верхні форзац, спінка). Рэшта ад папяровай налепкі з нумарам «663» на верхнім форзацы.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Бібліятэчныя паметкі: «N1315» (чарніла, верхні форзац); «6й экз», «Псалтирь. Вильна, 1575 г.», «Провер. МК» [Музей кнігі] (аловак, верхні і ніжні форзацы).

Верагодна, пасля 1845 г. наш асобнік быў канфіскаваны ў былых уладальнікаў-стараабрадцаў і стаў уласнасцю Сінадальнай бібліятэкі. Сінадальная бібліятэка ў Маскве была адным з буйнейшых кнігазбораў Еўропы. Раней яна называлася Патрыяршай, а ў 1721 г. у сувязі з установай Сінода атрымала новую назву. Пры бібліятэцы захоўваліся рукапісы і кнігі, адабраныя ў стараабрадцаў у 1841–1855 гг. [11, с. 160–161]. Частка з іх была перададзеная ў Маскоўскую духоўную акадэмію.

У 1854 г. падчас барацьбы з стараабрадніцтвам у Маскоўскай духоўнай акадэміі было адкрыта місіянерскае аддзяленне. У бібліятэцы быў створаны спецыяльны раздзел, прысвечаны стараабрадніцкай літаратуры. Навучэнцы карысталіся кнігамі як дапаможнікамі для практычных заняткаў. З Сінадальнай бібліятэкі ў бібліятэку Маскоўскай духоўнай акадэміі былі перададзены 224 старадрукаваныя кнігі і 240 рукапісаў [11, с. 95, 162].

Верагодна, такім чынам трапіў у склад фундаментальнай бібліятэкі і наш асобнік. Звычайна рукапісы там мелі падвойную нумарацыю, якая ўключала стары нумар, авальны штамп «Библіотека московской духовной академіи» і свае экслібрысы, якія наклейваліся на спінку і на адвароты верхняга вечка пераплёта [11, с. 98–99]. Магчыма, на асобніку захаваліся рэшткі апошняга з лічбай «663».

У 1919 г. бібліятэка Маскоўскай духоўнай акадэміі была поўнасцю перададзена Румянцаўскаму музею [11, с. 101]. Бібліятэка, якая была створана ў 1862 г. у складзе музея, у 1924 г. атрымала назву Дзяржаўнай бібліятэкі СССР імя У. І. Леніна. І ўжо адсюль паступіла ў Мінск на сучаснае месца захавання.

Асобнік Псалтыра 1576 г. меў няпросты, але шчаслівы лёс. Ён не загінуў, не быў знішчаны падчас войнаў, палітычных і рэлігійных катастроф. Кніга, выдадзеная ў Вільні, пэўны час была ў Расіі, цяпер захоўваецца ў Мінску. Асобнік напачатку існаваў у жывой традыцыі, потым перайшоў на захоўванне ў бібліятэкі. Кніга карысталася павагай і шанаваннем. Яе зберагалі, старанна рэстаўравалі, рупліва ўзнаўлялі страчаны тэкст. Кнігу чыталі і вывучалі.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by


1. *Билевич, В.* В. Белорусские книги кирилловской печати XVI–XVII веков в фондах ФБАН БССР / В. В. Билевич // Из истории книги в Белоруссии. – Минск, 1976. – С. 93–112.

2. *Вознесенский, А. В.* К истории славянской печатной Псалтири : московская традиция XVI–XVII веков : простая Псалтирь / А. В. Вознесенский. – Москва ; Санкт-Петербург : Альянс-Архео, 2010. – 676, [2] с.

3. *Вознесенский, А. В.* Об особенностях бытования старопечатных книг / А. В. Вознесенский // Древнерусское духовное наследие в Сибири : научное изучение памятников традиционной русской книжности на востоке России (1965–2005) : [сб. науч. ст.] / Гос. публ. науч.-техн. б-ка Сибирского отд-ния Рос. акад. наук, Гуманит. фак. Новосибирского гос. ун-та ; сост. и отв. ред.: Е. И. Дергачева-Скоп и В. Н. Алексеев. – Новосибирск : ГПНТБ СО РАН, 2008. – Т. 1. – С. 175–184. – (Книга и литература).

4. *Гусева, А. А.* Издания кирилловского шрифта второй половины XVI века : сводный каталог : в 2 кн. / А. А. Гусева ; под общ. ред. Л. И. Сазоновой ; Рос. гос. б-ка. – Москва : Индрик, 2003. – Кн. 1. – 638, [9] с. : ил.

5. Издания кириллической печати XV–XVI вв. (1491–1600 г.) : каталог книг из собрания ГПБ / Рос. нац. б-ка ; сост. В. И. Лукьяненко ; ред. В. М. Загребин. – Санкт-Петербург, 1993. – 346 с.

6. *Каратаев, И. П.* Описание славяно-русских книг, напечатанных кирилловскими буквами. Т. 1. С 1491 по 1652 г. / И. П. Каратаев // Сборник отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. – Санкт-Петербург, 1883. – Т. 34, № 2. – 554 с.

7. *Клепиков, С. А.* Филиграни на бумаге русского производства XVIII – начала XX века / С. А. Клепиков ; Сибирское отд-ние АН СССР, Ин-т истории, филологии и философии, Сибирское отд-ние Археографической комиссии. – Москва : Наука, 1978. – 238 с. : ил.

8. *Немировский, Е. Л.* Книги кирилловской печати каталог Е.Л. Немировский, Е. А. Емельянова. – Москва : Пашков дом, 2009. – [Кн. 2] : 1551–1600. – 318, [1] с. : ил. – (Книжные памятники Российской государственной библиотеки).

9. *Никольский, К. Т.* Обозрение богослужебных книг православной российской церкви по отношению к церковному уставу / К. Т. Никольский. – Санкт-Петербург : Типография Императорской академии наук, 1858. – 435 с.

10. *Петров, А. Е.* «Скитское покаяние» в русской духовной традиции [Электронный ресурс] / А. Е. Петров – Режим доступа: http://pstgu.ru/download/1235162501.2.pdf. – Дата доступа: 11.08.2015.

11. Рукописные собрания Государственной библиотеки СССР им. В.И. Ленина : указатель / Гос. б-ка, Отд-ние рукописей. – Москва : ГБЛ, 1983–1986. – Т. 1, вып. 2, 1917–1947. – 381 с. – (К 120-летию Гос. б-ки СССР им. В. И. Ленина).

12. Філіграні архіўных дакументаў Беларусі XVI – пачатку XX ст. / Дэпартамент па архівах і справаводстве М-ва юстыцыі Рэсп. Беларусь, Беларус. навукова-даследчы ін-т дакументазнаўства і архіўнай справы [склад. В.С. Пазднякоў]. – Мінск, 2013. – 254, [1] с. : іл.

13. *Laucevičius, E.* Popierius Lietuvoje XV–XVIII a. : atlasas / E. Laucevičius ; Lietuvos TSR Mokslų Akademijos Centrinė Biblioteka. – Vilnius, 1967. – 577 s.




Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

**Summary**

*Aliena Citavec.* **The Psalter of 1576: The Lot of the Book**

The publication reveals the history of existence of «Psalm with Red Points» from the funds of the Central Science Library of the National Academy of Sciences of Belarus. The book was published by Piotr Mscislaviec in Vilna at theMamonichy House in 1576. The original issue has survived into the present age having lost several pages at the beginning and at the end of the book. During the restoration performed by the Old-Believers during the first half of the 19$^{th}$ century, 74 hand written pages were interwoven in the book. In addition to the lost part of the original text there were new texts taken from the later Moscow pre-reform editions which were required to make the Psalms of the 16$^{th}$ century adaptable for everyday use in the 19$^{th}$ century. After 1845, the copy was taken away from the Old-Believers and several major libraries in Moscow in turn became its owners.

*Наталия Бондар*

# БЕЛОРУССКИЕ КИРИЛЛИЧЕСКИЕ ИЗДАНИЯ XVII–XVIII стст. В СОБРАНИИ НАЦИОНАЛЬНОЙ БИБЛИОТЕКИ УКРАИНЫ ИМЕНИ В. И. ВЕРНАДСКОГО

*В статье рассмотрены кириллические издания, напечатанные ведущими белорусскими типографиями Кутейны, Буйничей, Могилева, Гродно. Изучение бытования экземпляров свидетельствует об их активном использовании в Украине, в большинстве на Волыни и Поднепровье, в продолжение длительного времени, их функционировании в монастырских, церковных, музейных собраниях, в учебных заведениях и частных библиотеках. Эвристическая работа с белорусскими изданиями дала возможность выявить любопытные материалы из истории давних белорусских переплетов, в частности, кутеинских, позволила внести некоторые уточнения и поправки в известные библиографические описания книг на основе изученных экземпляров.*

Национальная библиотека Украины имени В. И. Вернадского (далее – НБУВ) – наибольшее книжное собрание Украины. Среди кириллических старопечатных книг собрания довольно широко представлены и белорусские кириллические издания, напечатанные ведущими белорусскими типографиями Кутейны, Буйничей, Могилева, Гродно, среди которых редкие и уникальные. Также в собрании имеется большое количество старопечатных книг, опубликованных в Вильнюсе в типографиях П. Мстиславца, В. Гарабурды, Мамоничей, Вильнюсского Святодуховского братства, в Вевиве, то есть в литовских типографиях, традиционно



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by